# Валерый Буцько




## Пра службу ў Афганістане расказвае воін-інтэрнацыяналіст Валерый Буцько

На ўліку ваеннага камісарыята ў Астравецкім раёне зарэгістравана 65 воінаў-інтэрнацыяналістаў і 2 вольнанаёмныя. Здавалася б, сухія лічбы. На справе –лёс людзей.

Пра ветэранаў-афганцаў пішу не першы год. Здавалася б, вядомая тэма, добра вывучаныя гістарычныя звесткі, з большасці знаёмыя прозвішчы і твары. Але зноў і зноў штосьці адкрываю для сябе, не перастаю здзіўляцца пачутаму і разам з героямі перажываю іх Афганскую вайну…Лёс Валерыя Буцько з Дайлідак і Адама Етко з Кемелішак у нечым падобны. Абодва вясковыя хлопцы, пасля заканчэння сярэдняй школы адвучыліся на шафёра, паспелі некалькі месяцаў папрацаваць, а восенню 1982-га пайшлі ў армію і трапілі ў Афганістан. Абодва праслужылі звышнормы, вярнуліся дадому без раненняў і паціху сталі вяртацца ў мірнае жыццё. Сёння яны дзеляцца сваімі ўспамінамі.

Расказвае Валерый

Шлях на Афган

– Родам я з Медрыкаў. Правы трактарыста атрымаў яшчэ ў школе, а пасля яе заканчэння адвучыўся ў аўташколе на “В” і “С”. Праўда, працаваць пайшоў не вадзіцелем, а ліцейшчыкам у дайлідскі цэх – ён тады толькі

адкрыўся, і моладзь адусюль уладкоўвалася, бо плацілі вельмі добра. Але рабіў усяго некалькі месяцаў – прыйшла павестка ў войска. Як зараз памятаю, пайшоў 26 верасня. Спачатку паехалі на Гродна – там, калі медкамісію праходзілі, упершыню і пачулі пра Афганістан. Ну а што мы? Маладыя, гарачыя, адважныя, а па сутнасці – дзеці дзецьмі. Афган? Хай будзе Афган! Куды накіроўваюць, туды і паедзем. Ёсць загад – мы яго выконваем. З абласнога цэнтра адправілі ў Мар'іну Горку, адтуль – у Туркменію. Два месяцы ў каранціне праходзілі падрыхтоўку, а пасля нас пасадзілі на самалёт – чалавек 200 было. Дарэчы, двое знаёмых з Ашмянскага раёна сустрэў. І паляцелі мы ў Афганістан.

Кандагар

– Службу праходзіў у 70-й мотастралковай брыгадзе, якая размяшчалася ў Кандагары. Спёка там стаяла несусветная. Днём +50-60 градусаў – гэта норма. Ды і ноччу горача было. Мы прасціну намочвалі і накрываліся – пакуль яна вільготная, спіш нармальна, а пасля зноў ні дыхнуць. Зімой снегу амаль не бачылі – раставаў ледзь выпаўшы. Але такая вільгаць горш за мароз. Знаходзіліся мы ў пустыні – нічога незвычайнага, пакуль не трапіш у аазіс – вось там было на што паглядзець, прыгажосць неапісальная.

Аднак усё гэта было пасля… Запомнілася, як прыляцелі ў Кандагар. Стаяла ноч, наша рота адсутнічала – была ў засадзе. Праз двое сутак толькі вярнуліся. Уяўляеце: сядзім мы, "зялёныя" навабранцы, і заходзяць яны – з аўтаматамі, гранатамі, штыкамі. Дый у палатцы куды ні ступіш – усюды зброя. Нязвыкла? Не тое слова! Але абставіны былі такімі, што мы хутка да ўсяго прывыклі.



Абавязкі

– Быў мотастралком, пасля паўгода – вадзіцелем бронетранспарцёра (БТР), машыну спісалі – зноў мотастралком. Значыўся кулямётчыкам, але хадзіў у асноўным з аўтаматам. Наша рота была засаднай. Пастулала паведамленне, што дзесьці павінен ісці варожы караван са зброяй – і мы пачыналі дзейнічаць. Прыходзілі на азначанае месца і чакалі. Задача – узяць караван, каб зброя не дайшла да пункта прызначэння. Такія паходы звычайна доўжыліся 2-3 сутак. Вярталіся, мыліся, прыводзілі ў парадак форму, адпачывалі – і на чарговае заданне. Бывалі і няўдалыя паходы, калі вярталіся ні з чым. Але такое рэдка здаралася, бо наш ротны адмыслова ведаў ваенную справу і дакладна ставіў засады. Год з намі праслужыў, а пасля іншы прыйшоў.

Суправаджалі мы і калоны. Яны ішлі па бетонцы – так называлі галоўную дарогу, а мы адыходзілі метраў на 100 убок і абстрэльвалі зялёнку (мясцовасць, пакрытая раслiннасцю, дзе звычайна хаваліся душманы. – Заўв. аўт.), каб калону не змаглі атакаваць.

Хадзілі ў рэйды. Пастулала інфармацыя, што ў кішлак наведаліся душманы, роту падымалі – і мы ішлі "часаць" паселішча. Гэта звалася рэйдам. Хаця, па сутнасці, першымі туды павінны былі заходзіць афганскія салдаты, а мы іх ззаду прыкрываць або ацапіць мясцовасць вакол і не ўмешвацца. На справе ж яны без нас наогул нікуды не хадзілі.

На валаску…

– Цяпер разумею, што рызыкавалі амаль штодня, а тады… На шчасце, у маладосці ўсё ўспрымаецца інакш. Толькі бліжэй да дэмбеля пачаў задумвацца больш сур'ёзна аб тым, што адбывалася побач. Хацелася вярнуцца дадому. Ці было страшна? Падчас выконвання баявых заданняў – канешне. Хлусіць той, хто кажа, што нічога не баяўся. Але вярталіся, выдыхалі – і пачыналі зноў жартаваць, смяяцца… Пра жахлівае гаварыць не хацелася…

Двойчы мог падарвацца, але абыходзілася. Адзін раз патрапіў на расцяжку гранаты – зачапіў нагой, але своечасова пачуў знаёмае "шчоўк" і паспеў адскочыць у разбураную мячэць, што знаходзілася побач. Другі раз быў на БТР – таксама ўсё абышлося. Пашанцавала…

Дадому…

– У арміі я затрымаўся і праслужыў 2,5 гады. Загад аб звальненні прыйшоў раней, але доўга чакалі замену, пасля – пакуль яна прайшла навучанне. У выніку прабыў яшчэ 5 месяцаў. (Усміхаецца.) Дадому дабіраўся пяць сутак на цягніку – не змог узяць білет на самалёт. Вярнуўся 19 лютага 1985-га. Дарэчы, першы год бацькі не здагадваліся, што я ў Афганістане. Каб не палохаць, напісаў, што застаўся ў Туркменіі, а на палявой пошце адрас не значыцца. Толькі брат ведаў, дзе служу, – ён пасля ім і прагаварыўся. Як сустрэлі? Абдымалі і плакалі з радасці, што вярнуўся жывы і здаровы.

З арміі прыйшоў іншым. Проста там мы хутка сталі дарослымі – навука і вопыт на ўсё жыццё. Але я ні аб чым не шкадую, значыць, так было трэба.

А яшчэ, уяўляеце, праз 25 гадоў мы, былыя саслужыўцы, аб'яднаныя Афганам, сустрэліся зноў! Двое з нашых заняліся пошукамі і знайшлі нумары тэлефонаў амаль усёй роты. І мы ўбачыліся ў 2010 годзе! Спачатку беларусы, а нас было шасцёра, сабраліся ў мяне ў Дайлідках. А праз месяц паехалі ва

Уладзікаўказ – там былі ўсе нашы, чалавек 40 дакладна! Прайшло столькі гадоў, а было адчуванне, быццам і не развітваліся. Гэта такая сувязь і сяброўства, непахісныя часам, што нельга растлумачыць. Цяпер мы не губляемся: з далёкімі стасуемся ў інтэрнэце і сазваньваемся, а з беларусамі час ад часу бачымся. Сябруем не толькі мы, але і нашы дзеці. Афганская вайна не проста звяла нас разам у адной палатцы і баявых паходах, выпрабоўваючы на трываласць, – яна парадніла. Мы не проста таварышы, воіны-інтэрнацыяналісты. Мы – браты назаўсёды!




Текст: Марина Мацкевич
Фото: Марина Мацкевич и из архива героя
https://www.ostrovets.by/news/novosti/news42378.html